УДК 378

**А.М. МАКАРЭВІЧ**

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС: ПРАБЛЕМЫ СТВАРЭННЯ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫКАРЫСТАННЯ
## (з вопыту выкладання гісторыі беларускай літаратуры, польскай мовы ва УА “МДУ імя А.А. Куляшова”)

*Зыходзячы з вопыту працы аўтара, а таксама калег з БДУ з вучэбна-метадычнымі комплексамі, вызначаюцца мэты, задачы, структура комплексаў, характарызуюцца некаторыя з тых, якія ўжо маюцца. Прапаноўеаецца два блокі комплексаў і схема іх стварэння. У якасці ілюстрацый характарызуецца комплекс, які створаны польскімі аўтарамі (Малгажата Малалепша, Анета Шымкевіч) для тых, хто вывучае польскую мову як замежную, а таксама першы блок вучэбна-метадычнага комплексу па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская дзіцячая літаратура”, створаны на кафедры беларускай літаратуры УА “МДУ імя А.А. Куляшова”. Выказваюцца прапановы адносна парадку стварэння вучэбна-метадычных комплексаў традыцыйнага тыпу пад кіраўніцтвам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.*

**Комплекс** – сукупнасць прадметаў, з’яў, дзеянняў, уласцівасцей, якія складаюць адно цэлае [1].

Пры гэтым варта дадаць, што комплекс, аб’яднаны адзінствам мэт, задач, перспектыў, спрыяе больш эфектыўнаму вырашэнню пэўных праблем у параўнанні з вырашэннем гэтых праблем паасобна існуючымі адзінкамі, якія не паяднаны паміж сабой агульнай канцэпцыяй.

У метадычнай літаратуры даюцца розныя азначэнні вучэбна-метадычнага комплексу. Звернемся да аднаго з іх.

*“Под учебно-методическим комплексом будем понимать систему взаимосвязанных и взаимодополняющих средств обучения, проектируемых в соответствии с учебной программой и выбранным дидактическим процессом, обеспечивающих деятельность обучающих и обучаемых в образовательном процессе в соответствии с его целями и задачами, а также спецификой изучаемой дисциплины”* [2].

Для ілюстрацыі можна прывесці наступныя паралелі: **1)** падручнікі, метадычныя рэкамендацыі, зборнікі тэкстаў, задач, тэстаў і да т. п. – усё падрыхтавана рознымі аўтарамі, аўтарскімі калектывамі, але без адзінай метадалогіі даследавання, методыкі падачы вучэбнага матэрыялу, арганізацыі самастойнай работы студэнтаў і інш. // **2)** сукупнасць крыніц, распрацаваная адным аўтарам (ці адным аўтарскім калектывам) *на канцэпцыйным навукова-метадалагічным і ме-*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

*тадычным грунце, аб'яднаная адзінствам мэт, задач, зместу.* Натуральна, што другі з прыведзеных тут прыкладаў дае падставы развіваць ідэю аб эфектыўнасці ў навучальна-выхаваўчым працэсе такой сукупнасці.

Маючы пад увагай адну з галоўных зыходных у ідэі ВМК – *канцэпцыйнае навукова-метадалагічнае і метадычнае яго адзінства,* – вызначым мэты і задачы ВМК. Ускосна яны вызначаюцца, напрыклад, у вучэбна-метадычным дапаможніку, падрыхтаваным РІВШ БДУ [3] (раздзел "Концептуальный подход и исходные принципы"). Абапіраючыся на прынцыпы, сфармуляваныя ў дадзенай крыніцы, а таксама вопыт стварэння ВМК па беларускай дзіцячай літаратуры на кафедры беларускай літаратуры УА "МДУ імя А.А. Куляшова", сфармулюем асноўныя мэты і задачы ВМК, улічыўшы, што *ён (комплекс) вызначае двухбаковую дзейнасць – выкладанне і навучанне ў іх адзінстве.*

**Мэты**:

**a.** спрыяць больш эфектыўнай рэалізацыі адукацыйнага стандарту;

**b.** стварыць сістэмна-метадычнае забеспячэнне вучэбнага працэсу па адпаведнай вучэбнай дысцыпліне (праграма навучальна-метадычнай дзейнасці, забеспячэнне яе адпаведнымі сродкамі навучання);

**c.** выпрацаваць сістэмна-дзейнасны падыход да забеспячэння вучэбнага працэсу як цэласнай з'явы.

**Задачы**:

a. стварэнне двух частак ВМК (аб іх пойдзе гутарка ніжэй) – адпаведнага комплексу вучэбна-метадычных крыніц, якія забяспечаць якасць, адзінства і цэласнасць выкладання і навучання;

**b.** выпрацаваць навукова-метадычную праграму дзейнасці выкладчыка ў кантэксце працы з ВМК;

**c.** выпрацаваць праграму аўдыторнай і пазааўдыторнай (самастойнай) працы студэнта па сістэме перспектыўных ліній пры вывучэнні ім адпаведных вучэбных дысцыплін з дапамогай ВМК.

Вучэбна-метадычны комплекс з'яўляецца эфектыўным, калі ён не толькі рэпрэзентаваны такім, а сапраўды мае сукупнасць неабходных для эфектыўнай яго дзейнасці частак:

• вучэбнай:
  – дапаможнікі;
  – падручнікі;
  – курсы лекцый;
  – зборнікі;
  – хрэстаматыі і да т.п.

і

• метадычнай:
  – тыпавыя альбо базавыя праграмы;
  – рабочыя праграмы;
  – вучэбна-метадычныя карты;
  – метадычны дапаможнік выкладчыка (падручнік выкладчыка, настаўніка)[1], зарыентаваны на адпаведную метадычную тэхналогію;
  – грунтоўныя вучэбна-метадычныя дапаможнікі па арганізацыі аўдыторнай і самастойнай працы студэнтаў (настаў час адмаўляцца ад так званых "ме-

[1] Такі падручнік, напрыклад, з'яўляецца часткай комплексу – падручнік настаўніка, падручнік студэнта, сшытак практыкаванняў для студэнта – з польскага праекта "HURRA": [4]; гэтая серыя заснавана на агульнадзяржаўнай праграме падрыхтоўкі да экзамену на пасведчанне ведання польскай мовы як замежнай; падручнік настаўніка прапаноўвае падрабязную метадычную сістэму працы педагога ў кантэксце вывучэння кожнай тэмы.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

тадычных рэкамендацый", "метадычных парад", "вучэбных дапаможнікаў", у якіх прапаноўваецца адпаведная тэматыка, пералік пытанняў і літаратуры да іх без разгорнутых, метадычна абгрунтаваных і выверaных практыкай рэкамендацый, парад, каментарыяў, прыкладаў, заданняў, характарыстык спецыфічных пытанняў, алгарытмаў вырашэння вучэбных задач і інш.);

– зборнікі тэстаў (тэставых заданняў) і інш.

Пры гэтым сукупнасць (нават падрыхтаваная адным аўтарам альбо адным аўтарскім калектывам) яшчэ не можа быць комплексам: тут неабходна ўмова, на якую ўжо звярталася ўвага вышэй, – метадычна-канцэпцыйнае адзінства і метадычна ўзгодненая цэласнасць. Акрамя гэтага, у кожнай з састаўляючых комплексу – і гэта будзе ўжо вышэйшы метадычны пілатаж – вучэбны і метадычны матэрыял павінен быць прадстаўлены комплексна і сістэмна паводле зместу і формы. Выразнай ілюстрацыяй гэтаму можа быць згаданае вышэй выданне (для нашай сітуацыі назавём яго як вучэбна-метадычны комплекс) па польскай мове як замежнай для студэнтаў з серыі "HURRA" Малгажаты Малалепшай і Анеты Шымкевіч[2].

У нашай краіне вядучай установай, выкладчыкі якой адны з першых і даволі актыўна звярнуліся да стварэння ВМК, з'яўляецца БДУ. Тут зроблена шмат у гэтым напрамку. Аднак варта пры гэтым заўважыць, што некаторыя з выданняў, якія рэпрэзентаваны ў БДУ як ВМК, могуць быць толькі адпаведнай часткай комплексу, бо на самай справе з'яўляюцца ў розных варыянтах камбінацыямі інфармацыйных матэрыялаў (пытанні лекцыйнага курса, планы практычных заняткаў, тэматыка рэфератаў, пытанні да экзаменаў і залікаў, тэсты, рабочыя праграмы і да т.п. – пры адсутнасці (альбо амаль поўнай адсутнасці) метадычнага і навучальнага матэрыялу для арганізацыі самастойнай работы студэнтаў)[3]. Пры гэтым трэба заўважыць, што выкладчыкі БДУ першымі пракладвалі шлях да стварэння ВМК, яны вырашалі не толькі прыватныя вучэбныя задачы для сваёй установы, а і рабілі значныя метадычныя назапашванні ў гэтым напрамку, якія карысныя для калег з іншых ВНУ.

У вучэбных установах нашай краіны ствараюцца ВМК, якія не маюць падручніка (вучэбнага дапаможніка) для студэнтаў. Пры такой сітуацыі, калі ці не ў кожнай навучальнай установе ствараюцца ВМК па адных і тых жа дысцыплінах, паўстае наступная праблема: крыніца тэарэтычнай, гісторыка-тэарэтычнай падрыхтоўкі для студэнтаў на ўзроўні падручніка – якой ёй быць. Адным з адказаў на

---

[2] У гэтым падручніку змешчаны наступны матэрыял у кантэксце адпаведнай камунікацыйнай альбо інфармацыйнай тэмы: 1) граматыка – кароткія тэарэтычныя звесткі; 2) разнастайныя, неаднатыпныя навучальныя практыкаванні; 3) кароткія слоўнікі; 4) камунікацыйныя сітуацыі; 5) лінгвістычныя гульні; 6) тэксты з заданнямі да ўспрыняцця тэксту прамоўленага (падручнік і сшытак студэнта суправаджаецца дыскамі SD); 7) малюнкі, схемы, крыжаванкі, 8) ілюстрацыі дзелавых дакументаў, інфармацыйных сайтаў і шм. інш. Такім чынам, матэрыял, комплексна прадстаўлены ў падручніку, спрыяе эфектыўнаму вырашэнню задачы фарміравання ўменняў разумення замежнай мовы і вуснай камунікацыі з носьбітамі вывучаемай мовы. Падручнікі ж, створаныя ўсходнеславянскімі аўтарамі, хоць і вызначаюцца сваёй навукова-лінгвістычнай і метадычнай сістэмнасцю, з'яўляюцца нецікавымі для студэнтаў, бо яны заакадэмізаваныя, сухія, пазбаўленыя жывога слова і жывой камунікацыі.

[3] Напрыклад, ВМК В.І. Іўчанкі ([5]) уключае ў сябе вучэбна-метадычны план вывучэння курса, практыкум, прыкладны пералік тэстаў.

ВМК Р.М. Кавалёвай ([6]) уключае вучэбную праграму курса, модульны практыкум са спісам літаратуры, кантрольныя тэсты, блок "Змест і арганізацыя самастойнай работы студэнтаў", пералік прынцыпаў бягучай і агульнай атэстацыі работы студэнтаў, пытанні для падрыхтоўкі да дыферэнцыраванага заліку, тэматыку курсавых, дыпломных і навукова-даследчых работ.

ВМК А.В. Шаўцовай ([7]) уключае тэматычны план курса, літаратуру, пытанні лекцыйнага курса па тэмах, тэматыку і пытанні кантрольных работ, пытанні да экзамену, тэматыку курсавых і дыпломных работ [7].

такое пытанне можа быць наступнае: падручнікі, рэкамендаваныя тыпавой праграмай. Аднак па некаторых вучэбных дысцыплінах падручнікі ствараліся, калі яшчэ не было адпаведных тыпавых праграм (як вядома, яны дзейнічаюць на працягу 5 год); некаторыя з іх ствараліся аўтарскім калектывам без уліку адзінства мэт навучання. Напрыклад, у працэсе выкладання гісторыі беларускай літаратуры выкарыстоўваецца акадэмічная гісторыя беларускай літаратуры [8] – крыніца, якая калі не поўнасцю, то ў многіх выпадках не адпавядае метадычным прынцыпам выкладання дадзенай вучэбнай дысцыпліны; бо гэтая крыніца навуковая. У такой сітуацыі студэнты аказваюцца перад выбарам: альбо інтэлектуальна "пералапачваць" некалькі крыніц, вылучаючы істотнае для распрацоўкі адпаведных пытанняў (на гэта ідзе багата часу, які патрэбен для чытання, напрыклад, мастацкіх тэкстаў), альбо спыніцца на засваенні матэрыялу адной з іх, атрымліваючы, такім чынам, інфармацыю няпоўную. Найчасцей студэнты выбіраюць апошняе, што не спрыяе грунтоўнай іх падрыхтоўцы. Акрэсленыя вышэй праблемы вылучаюць на першы план наступную: праблему стварэння падручніка (вучэбнага дапаможніка), які б поўнасцю адпавядаў тыпавой праграме[4]. Натуральна, што на пэўных этапах падрыхтоўкі ВМК усе навучальныя установы не змогуць падрыхтаваць такія падручнікі, урэшце гэта і не варта рабіць. Якое ж выйсце? Яно можа быць наступным. Ствараецца першы блок ВМК:

**a.** тыпавая праграма (альбо выкарыстоўваецца тая, якая ўжо маецца);

**b.** падручнік (вучэбны дапаможнік), абавязковы для выкарыстання ва ўсіх ВНУ; аўтарам (-мі) яго могуць быць вядучыя спецыялісты (аўтарскія калектывы) у пэўнай галіне навук пры ўмове конкурсу, аб'яўленага Міністэрствам адукацыі на права стварэння такіх падручнікаў.

На грунце першага блока ва ўсіх установах ствараюцца ВМК (другі блок) у строгай адпаведнасці зместу, мэтам і задачам названых вышэй крыніц. Структура такога блока ВМК можа быць наступнай:

**c.** рабочая праграма, вучэбна-метадычная карта дысцыпліны;

**d.** курс лекцый;

**e.** вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў, падрыхтаваны ў кантэксце працы выкладчыка (-аў) па адпаведных методыках і тэхналогіях;

**f.** метадычны дапаможнік для выкладчыка;

**g.** зборнік заданняў, тэстаў і да т.п.

Усё гэта будзе спрыяць таму, што пры вывучэнні адной і той жа дысцыпліны ў розных ВНУ ўвага будзе канцэнтравацца вакол аднаго і таго ж паводле зместу вучэбнага поля, а грунтавацца, магчыма, на розных метадычных і тэхналагічных сістэмах, зарыентаваных на больш эфектыўнае дасягненне мэт і задач навучання ў залежнасці ад умоў працы ВНУ, кантынгенту студэнтаў, асаблівасцяў спецыяльнасці і інш. У адваротным выпадку мы апынемся ў сітуацыі, калі пачнецца гонка за ВМК толькі дзеля справаздачы. І пры гэтым сталічныя ВНУ акажуцца манапалістамі ў такой справе, бо ў іх руках кіраванне метадычнымі структурамі, якія даюць дазвол на існаванне той ці іншай часткі ВМК. Наш аўтарскі калектыў, які стварае ВМК па беларускай дзіцячай літаратуры, сутыкнуўся з такой манаполіяй, напрыклад, з боку УА "БДПУ імя М.Танка", калі даводзілася даказваць відавочныя метадычныя і метадалагічныя рэчы пры стварэнні тыпавой праграмы па гэтай вучэбнай дысцыпліне. І гэта было ва ўмовах, калі тыпавой праграмы не

---

[4] Пры гэтым можа паўстаць пытанне: ці абавязковай з'яўляецца наяўнасць падручніка як састаўной часткі ВМК. Думаецца, што абавязковай. Падручнік прапаноўвае матэрыял у яго сістэмным навукова-гістарычным аспекце. Іншыя ж часткі ВМК – курс лекцый, метадычныя матэрыялы і да т.п. – развіваюць палажэнні падручніка, канкрэтна іх ілюструюць, паглыбляюць, дапаўняюць, актуалізуюць яго матэрыял і інш., вырашаюць пэўныя задачы інавацыйнай адукацыі.

існавала па адпаведных спецыяльнасцях, а пэўныя спецыялісты з БДПУ яшчэ не тое што выдаць, а і стварыць сваю не змаглі.

Такім чынам, на грунце акрэсленага вышэй вымалёўваюцца два асноўныя шляхі ў кантэксце праблемы стварэння ВМК:

1) стварэнне першага блока ВМК для адпаведнай вучэбнай дысцыпліны; такі блок (структура яго акрэслена вышэй у пунктах "a" – "b") з'яўляецца базай, грунтам на ўзроўні Міністэрства адукацыі для стварэння другога блока;

2) стварэнне друга блока ВМК у ВНУ (структура яго акрэслена ў пунктах "c" – "g").

Прычым другі з гэтых шляхоў сведчыць пра адкрытасць прапанаванай тут сістэмы ВМК.

У якасці ілюстрацыі да прыведзеных вышэй прапаноў можа быць наступнае.

Пры стварэнні ВМК па беларускай дзіцячай літаратуры на кафедры беларускай літаратуры УА "МДУ імя А.А. Куляшова" ўлічваліся такія сучасныя напрамкі ў развіцці адукацыі, як гуманізацыя і дэмакратызацыя, пераход да шматварыянтнай і дыферэнцыраванай адукацыі. Пры гэтым пад ВМК разумелася класічнае абагуленае азначэнне, дадзенае Д. Зуевым: *"Учебный комплекс представляет собой систему дидактических средств обучения по конкретному предмету (при ведущей роли учебника), создаваемую в целях наиболее полной реализации воспитательных и образовательных задач, сформулированных программой по этому предмету и служащих всестороннему развитию личности учащегося"* [9]. Таму заканамернай была падрыхтоўка падручніка па дысцыпліне "Беларуская дзіцячая літаратура" – другога кампанента ВМК. На вядучую ролю падручніка пры стварэнні класічнага ўзору ВМК указваюць і аўтары вучэбна-метадычнага дапаможніка па стварэнні ВМК па модульнай тэхналогіі: *"Обычно под составом УМК имеются в виду компоненты: учебник, пособие для преподавателя, практикум, словарь и т. д. (при ведущей роли учебника). Иногда такой состав считают классическим, и, по-видимому, не без оснований"* [3].

У выніку на кафедры беларускай літаратуры УА "МДУ імя А.А. Куляшова" па вучэбнай дысцыпліне "Беларуская дзіцячая літаратура" створаны тыпавая праграма (2005) [10], вучэбны дапаможнік пад рэдакцыяй А.М. Макарэвіча, М.Б. Яфімавай з грыфам Міністэрства адукацыі "Беларуская дзіцячая літаратура" (2007) [11], да гэтай часткі ВМК мэтазгодна далучыць і хрэстаматыю "Беларуская дзіцячая літаратура" (2003), створаную М.Б. Яфімавай і В.М. Ляшук [12][5], бо М.Б. Яфімава як вядучы спецыяліст па беларускай дзіцячай літаратуры ў нашай краіне з'яўляецца адным з аўтараў і навуковых рэдактараў згаданага вучэбнага дапаможніка і рэцэнзентам названай вышэй тыпавой праграмы. Гэты блок можа быць прыняты як агульны для ўсіх ВНУ, у якіх выкладаецца дадзеная вучэбная дысцыпліна. Акрамя гэтага, на нашай кафедры працягваецца праца па стварэнні другога блока ВМК па беларускай дзіцячай літаратуры: слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў, вучэбна-метадычны дапаможнік па арганізацыі самастойнай працы студэнтаў. Такі ж блок можа стварацца і ў іншых ВНУ, але на метадычным і вучэбным грунце, прапанаваным тыпавой праграмай і названым вышэй вучэбным дапаможнікам. У такім выпадку забяспечваецца адзінства вучэбна-метадычных прынцыпаў выкладання дысцыпліны ў розных ВНУ.

---

[5] У сувязі з фактам выхаду ў свет яшчэ першага выдання гэтай хрэстаматыі варта згадаць наступную ацэнку дзейнасці М.Б. Яфімавай па стварэнні такой крыніцы ведаў для студэнтаў: "*Маргарыта Барысаўна Яфімава шмат зрабіла для таго, каб вярнуць у беларускую дзіцячую літаратуру лепшыя творы для дзяцей, аўтары якіх доўгія гады знаходзіліся пад забаронай, былі незаслужана забытыя. Яна імкнецца больш поўна, цэласна прачытаць гісторыю беларускай літаратуры, эстэтычна ўдумна выявіўшы яе ранейшыя і цяперашнія здабыткі*" [13].

І яшчэ адзін каментарый да прыведзеных фактаў. Згаданы вучэбны дапаможнік ствараўся аўтарскім калектывам, у склад якога ўваходзілі не толькі выкладчыкі нашай кафедры, але і спецыялісты з іншых навучальных устаноў. Пры гэтым навуковы рэдактар (а ён і адзін з аўтараў названай тыпавой праграмы), здзяйсняючы агульнае навукова-метадычнае кіраванне працай калектыву, звяртаў асаблівую ўвагу на адзінства метадычных прынцыпаў падачы вучэбнага матэрыялу ў дапаможніку ў адпаведнасці з тыпавой праграмай.

Адно з цэнтральных патрабаванняў інавацыйнай адукацыі – яна "павінна быць праблемна- і практыкаарыентаванай" [14] не толькі ў час навучання студэнта ў ВНУ, але і на перспектыву яго прафесійнай дзейнасці. У гэтым кантэксце важнай з'яўляецца сістэма перспектыўных ліній пры выкладанні адпаведных дысцыплін з выкарыстаннем ВМК.

Любы этап работы і звязаныя з ім віды і формы дзейнасці павінны быць не толькі матываваныя, але і накіраваныя на будучае вывучэнне, засваенне і выкарыстанне ўжо назапашаных ведаў, уменняў і навыкаў у кантэксце новых, яны павінны спрыяць больш рацыянальнаму і якаснаму ўспрыняццю новых ведаў.

Бліжняя перспектыва. *Прапанаваны, напрыклад, па літаратуразнаўчым цыкле ВМК матэрыял выкарыстоўваецца студэнтам пры вывучэнні канкрэтнай дысцыпліны.*

Сярэдняя перспектыва. *Такі матэрыял выкарыстоўваецца ў працэсе выканання творчай навуковай студэнцкай работы па сумежных дысцыплінах, выканання творчых самастойных работ, пры падрыхтоўцы да залікаў і экзаменаў (у тым ліку дзяржаўных) па іншых вучэбных дысцыплінах, у час вытворчай практыкі, самастойных даследаванняў у кантэксце асабістых творчых і навуковых арыентацый студэнтаў.*

Дальняя перспектыва. *Інтэлектуальныя назапашванні па сістэме перспектыўных ліній і фарміраванне ўменняў і навыкаў у іх кантэксце не заканчваюцца здачай студэнтамі дзяржаўных выпускных экзаменаў. Гэта працэс даволі працяглы, які патрабуе ад асобы пастаяннага ўдасканалення яго формаў, назапашвання ведаў для пераходу колькасных назапашванняў у якасныя змены, назапашвання прафесійнай кампетэнтнасці. Вельмі важна, каб выпускнік, які ўжо абраў для сябе ў якасці метадалагічнага арыенціра сістэму перспектыўных ліній, кожны акт сваёй далейшай інтэлектуальнай дзейнасці здзяйсняў менавіта ў яе святле з арыентацыяй на тое, дзе, калі, у працэсе якога віду дзейнасці, пры звароце да якіх яго формаў спатрэбіцца чарговае яго інтэлектуальнае назапашванне ці прамежкавыя вынікі яго прафесійнай дзейнасці.*

Набытыя студэнтам у кантэксце працы з ВМК уменні і навыкі – гэта трывалы падмурак для яго далейшай прафесійнай дзейнасці. Галоўнае пры гэтым – не спыняцца на дасягнутым, а ўжо самастойна выпрацоўваць сваю метадалагічную сістэму працы ў адпаведнасці з прынцыпам перспектыўнасці.

Такім чынам, сістэма працы педагога і студэнта з ВМК – гэта не проста этапы вывучэння адпаведнай дысцыпліны, а менавіта сістэма, у межах якой павінна адбывацца не толькі дасягненне вынікаў бліжэйшай перспектывы, але і стварэнне ўмоў для дасягнення сярэдняй і дальняй.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Комплекс // ТСБМ. – Мінск, 1978. – Т. 2. – С. 710.
2. ***Бабко, Г.И.*** Учебно-методический комплекс: теория и практика проектирования (Методические рекомендации для преподавателей вузов) / Г.И. Бабков. – Минск: РИВШ, 2004 – С. 5.

3. Учебно-методический комплекс: модульная технология разработки: Учеб.-метод. пособие / А.В. Макаров и др. – Минск: РИВШ БГУ, 2001. – С. 13-15.
4. ***Małolepsza, Małg., Szymkiewicz, An.*** Hurra!!! Po Polsku 1 / Małg. Małolepsza, An. Szymkiewicz. – Wyd. II poprawione. – PROLOG Szkoła Jezuków Obcych, Kraków, 2007.
5. ***Іўчанка, В.І.*** Вучэбна-метадычны комплекс па курсе "Сучасная беларуская мова" (эксперыментальнае навучанне): у 4 ч. / В.І. Іўчанка – Мінск: БДУ, 2001. – Ч. 1.: Арфаграфія. Графіка. Лексікалогія (фразеалогія): Для студ. фак. журналістыкі. – 56 с.
6. ***Кавалёва, Р.М.*** Беларуская вусна-паэтычная творчасць: вучэб.-метад. комплекс для студэнтаў філал. фак. спец. 1 -21 05 01 "Беларуская філалогія" / Р.М. Кавалёва. – Мінск: БДУ, 2005. – 151 с.
7. ***Шавцова, А.В.*** Права человека (Право прав человека): Учеб.-метод. комплекс для студ-в юридического ф-та / А.В. Шавцова. – Минск: БГУ, 2005. – 95 с.
8. Гісторыя беларускай літаратуры XX ст: у 4 т. / рэдкал.: Ул. Гніламёдаў [і інш.].– Мінск: Бел. нав., 1999 – 2003.
9. ***Зуев, Д.Д.*** Школьный учебник / Д.Д. Зуев. – М.: Педагогика, 1983. – С. 215.
10. Беларуская дзіцячая літаратура: вучэб. прагр. / Склад. В.І. Караткевіч, А.М. Макарэвіч. – Магілёў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2005. – 40 с.
11. Беларуская дзіцячая літаратура: вучэб. дапам. / А.М. Макарэвіч [і інш.]; пад агул. рэд. А.М. Макарэвіча, М.Б. Яфімавай. – Мінск: Выш. шк., 2008. – 688 с.
12. Беларуская дзіцячая літаратура: хрэстаматыя / Склад. М.Б. Яфімава, В.М. Ляшук. – Мінск: Выш. шк., 2003. – 655 с.
13. Навукоўцы кафедры беларускай літаратуры XX ст. БДУ. Кароткі біябібліяграфічны даведнік. – Мінск: БДУ, 1999. – С. 70-71.
14. ***Косинец, А.Н.*** Инновационное образование – главный ресурс конкурентноспособной экономики государства / А.Н. Косинец // Советская Беларусь. – 2007. 30 окт. – С. 12.

Паступіў у рэдакцыю 17.01.2008 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова